# ЦЫТАТЫ ВЯЛІКІХ ПАЭТАЎ




«Часамі самае маленькае знаходзіцца ў блізкай і цеснай сувязі з самым вялікім. Трэба толькі ўмець знайсці месца іх стыку»
Якуб Колас


О край мой мілы!
Ўсёй душою
Хачу злучыцца я з табою,
Ў тваіх палях пазычыць сілу,
Ў тваёй зямлі сысці ў магілу…
Якуб Колас


Дарогі, вечныя дарогі!
Няма канца вам, ні супыну;
Вы жывы кожную часіну.
То поўны чараз спадзявання,
То страхаў цёмнага знікання"
Якуб Колас



# Якуб Колас
# «На ростанях»

*У першы ж дзень набажэнства прыходзіць пісар у царкву …*
*У некаторые ўрачыстыя дні царкоўнага набажэнства складаецца саматужны хор.*
*Дзяк проста не ўмее спяваць, але ў такіх выпадках спасылаецца на словы Свяшчэннага пісання :" Хваліце Бога на трубах, на арганах , на гуслях, на дудках , на цымбалах" …*


І ў людзей ты гонар страціш -
І цябе зракуцца:
Лепш змагацца вольным, браце,
Чым цярпець ды гнуцца.
Якуб Колас



«Не прыпадабняйся свінні,
што наеўшыся жалудоў, стала
лычом рыць карэнні таго дуба,
на каторым выраслі яны»

Якуб Колас

*"У 1905 годзе я хоць і не мог яшчэ добра арыентавацца ў партыях, але быў ужо заўзятым ворагам самадзяржаўя і ў гэтым кірунку вёў работу"*

***Якуб Колас***





Якуб Колас

Вобразы мілыя роднага краю,
Смутак і радасць мая!
Што маё сэрца да вас парывае?
Чым так прыкованы я
К вам, мае ўзгорачкі роднага поля,
Рэчкі, курганы, лясы,
Поўныя смутку і жальбы нядолі,
Поўныя смутнай красы?
Толькі я лягу і вочы закрыю,
Бачу я вас прад сабой.
Ціха праходзіце вы, як жывыя,
Ззяючы мілай красой.
Чуецца гоман мне спелае нівы,
Ціхая жальба палёў,
Лесу высокага шум-гул шчаслівы,
Песня магутных дубоў...
Вобразы мілыя, вобразы смутныя,
Родныя вёскі і люд,
Песні цягучыя, песні пакутныя!..
Бачу і чую вас тут.


Няма чаго чакаць панукі,
Калі работы поўны рукі.
Якуб Колас
stereodom.bloger.by